# ТЭЛЕАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ КАНЦЭПТУАЛІЗАЦЫІ ЭТЫКА-ПЕДАГАГІЧНЫХ ІДЭЙ У БЕЛАРУСІ X–XVIII СТСТ.

*В.С. Болбас*
*(УА МДПУ ім. І.П. Шамякіна, Мазыр)*

Пытанне аб мэтах выхавання з’яўляецца адным з самых значных і дынамічных у педагагічнай тэорыі і практыцы. Шэраг навукоўцаў адзначае, што патрэбна вылучаць як ідэальныя, так і рэальныя мэты выхаваўчага працэсу. Т.А. Ільіна разглядае тры групы мэт выхавання: генеральную, мэту на пэўным этапе фарміравання асобы і аператыўную [1, 64]. Значнасць пастаноўкі перспектыўных мэт выхавання, якія дазваляюць актывізаваць маральна-ствральную дзейнасць выхаванцаў, падкрэсліваў І.С. Мар’енка [2, 74].

Дастаткова доўгі час у педагагічнай навуцы пад мэтай выхавання разумелася фарміраванне гарманічнай усебакова развітой асобы (А.Д. Алфёраў, Ю.К. Бабанскі, В.Г. Бачарова, Я.В. Бандарэўская, Д.І. Вадзінскі, О.С. Газман, В.М. Коратаў, Б.Т. Ліхачоў, З.А. Мількова, Н.Л. Селіванава, А.У. Пятроўскі, М.М. Таланчук, І.Ф. Харламаў і інш.). Змяненне сацыяльна-культурнага асяроддзя, дынаміка парадыгм выхавання зрабілі актуальным пытанне аб канкрэтызацыі дадзенага падыходу ў вызначэнні мэт маральна-выхаваўчага працэсу. “Канцэпцыя выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь” у якасці мэты выхавання вылучае адраджэнне самакаштоўнасці асобы ў грамадстве і яе сацыялізацыю. Н.К. Катовіч акцэнтуе ўвагу на фарміраванні “чалавека-творцы”, “чалавека-дзеяча” [3, 104]. У.Д. Нікандраў слушна адзначае, што выхаванне чалавека ў духу агульначалавечых каштоўнасцей і ёсць правільнае вырашэнне праблемы мэт выхавання [4, 21].

Аналіз этыка-педагагічнай думкі Беларусі лагічна пачынаць з разгляду тэлеалагічна аспекту, праз які паказваецца яе ўзнікненне і анталагічная характарыстыка развіцця. Сам тэлеалагічны прынцып як аснова спецыфікі гуманітарных ведаў вылучае мэтавы кагнітыўны падыход у якасці парадыгмальнай устаноўкі фарміравання ідэй маральнага выхавання. У этыка-педагагічнай думцы Беларусі трактоўка мэт маральнага выхавання, з аднаго боку, у многім абумоўлена распрацоўкай агульных мэт выхавання сусветнага гісторыка-педагагічнага працэсу, з іншага боку, развіццё ідэй мэтавызначэння непасрэдна вызначалася існаваўшай сукупнасцю сацыяльна-духоўных каштоўнасцей. Як паказана вышэй, аснову вартасных арыентацый тагачаснага беларускага грамадства складалі сінкрэтычна аб’яднаныя народна-педагагічныя і хрысціянскія

МГПУ им. И.П. Шамякина

маральныя каштоўнасці, якія дапаўняліся прыўнесенымі звонку з культур іншых народаў элементамі агульначалавечых каштоўнасцей.

Развіццё маральна-выхаваўчых ідэй у этыка-педагагічнай думцы Беларусі непасрэдна вызначалася існаваўшай сукупнасцю сацыяльна-духоўных каштоўнасцей грамадства. Увогуле, мэты выхавання не толькі другасныя ў адносінах да грамадскіх каштоўнасцей, а нават трацічныя, бо апошнія фіксуюць грамадска-духоўныя набыткі і ўжо на аснове іх распрацоўваюцца адпаведныя нормы, якія, у сваю чаргу, вызначальна ўплываюць на фарміраванне выхаваўчых мэт [5, 3]. Маральныя каштоўнасці, якія арганічна ўваходзяць у менталітэт народа, з'яўляюцца там найбольш статычнымі складальнікамі. З цягам часу пад уплывам шэрагу фактараў адбываюцца пэўныя змены ў каштоўнасных арыентацыях грамадства. Са зменай маральна-духоўных каштоўнасцей адпаведна мяняюцца маральныя нормы і патрабаванні, што выклікае трансфармацыю маральна-выхаваўчых мэт, якія прадугледжваюць засваенне існаваўшай сістэмы маральна-духоўных каштоўнасцей і падтрымку іх функцыянавання. Ступень адпаведнасці мэт маральнага выхавання рэальна існуючай у грамадстве сістэме каштоўнасцей у многім забяспечвае выніковасць маральна-выхаваўчага працэсу.

Мэтавызначэнне маральнага выхавання канцэптуалізуе ідэі этыка-педагагічнай думкі. Тэлеалагізацыя маральных ведаў закладвае асновы распрацоўкі тэорый маральнага выхавання, засцерагае іх ад механістычнасці і фармалізму.

Перспектыўныя мэты выхавання ўвасабляюцца ў маральным ідэале, які змяшчае аксіялагічныя арыентацыі сваёй гістарычнай эпохі. Рэальныя мэты выхавання адлюстроўваюць фарміраванне пэўных адносін да свету, якія канкрэтызуюцца ў адносінах да самога сябе, іншых людзей, грамадства. Гэтая сістэма адносін да быцця ўтрымлівае ўстаноўку на самаразвіццё, самастварэнне, актыўнае і гарманічнае ўваходжанне ў культурна-гістарычны кантэкст соцыуму. Менавіта праз прызму такога падыходу і разглядалася мэта маральнага выхавання ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі X–XVIII стст.

У X–XIII стст. у этыка-педагагічнай думцы Беларусі распрацоўваецца маральны ідэал практычна для кожнага саслоўя. Так, для духавенства і асоб, якія вырашылі прысвяціць сваё жыццё служэнню Богу, ідэалам быў святы, манах-аскет, які поўнасцю адцураўся ад зямных інтарэсаў, клопатаў і спакусаў. К. Тураўскі адзначае, што "унутраныя дабрачыннасці інакаў ззяюць цудамі і што кожны, хто стаў на шлях аскезы і манаства, "жыццё вечнае наследуе" [6, 208].

Станаўленне феадальнай дзяржаўнасці абумовіла вылучэнне ў якасці самастойна-значнага ідэалу княжацкі ідэал, які, з аднаго боку, быў

МГПУ им. И.П.Шамякина

падпарадкаваны ўніверсальнаму аскетычнаму тыпу гэтай эпохі, а з іншага, утрымліваў у сабе элементы светапогляду дахрысціянскага грамадства, дзе як бы “прыродныя” якасці – прыгажосць, сіла, здароўе з’яўляліся станоўчымі ацэнкамі чалавека. Княжацкі ідэал у многім грунтаваўся на багатырскім ідэале, шырока прадстаўленым у старажытным эпасе з праслаўленнем актыўнасці, “славы” подзвігу. Маральнай значнасцю надзяляліся нястомнасць, удаласць, храбрасць, фізічная сіла. Царкоўны і княжацкі ідэалы садзейнічалі распрацоўцы паняцця – грамадзянскі бытавы ідэал.

З распаўсюджаннем на беларускіх землях антычнага разумення тэлеалогіі з амбівалентнай трактоўкай мэты: а) як растлумачальны прынцып; б) як анталагічная характарысыка быцця, – мэтавызначэнне ў маральным выхаванні ўздымаецца на новы ўзровень.

Такім чынам, можна канстатаваць, што існаваўшы ў этыка-педагагічнай думцы Беларусі падыход да мэтавызначэння ў маральным выхаванні надаваў гэтаму працэсу асноватворнае значэнне. Як паказвае аналіз, на працягу разглядаемага перыяду фарміруюцца найважнейшыя накірункі развіцця тэлеалагічных асноў этыка-педагагічнай думкі. Само мэтавызначэнне прызнавалася адпраўным момантам у распрацоўцы этыка-педагагічных ідэй. Тэлеалагізацыя непасрэдна садзейнічала канцэптуалізацыі этыка-педагагічнай думкі, што ва ўмовах Беларусі прадвызначыла асноўныя тэндэнцыі яе развіцця: секулярызацыя, гуманізацыя, дэмакратызацыя, талерантнасць, патрыятызм, актыўна-дзейсная пазіцыя асобы, гарманізацыя калектывісцкіх і індывідуалістычных асноў быцця грамадства.

Згодна з палажэннямі хрысціянскай этыкі, асноватворнымі дабрачыннасцямі былі вера, надзея і любоў, якія, перш-наперш, разглядаліся этычна ад закладзеных у іх маральных сэнсаў, а не ў якасці псіхалагічных станаў асобы. Вера азначала і адданасць Усявышняму і ўвасабляла ўпэўненасць, давер, вернасць. Жыццёвасць веры – гэта мараль у дзеянні. Надзея трактавалася не толькі этычна арыентавана, але і маральна змястоўна. Надзея звязваецца з цярплівасцю, упартасцю, ціхмянасцю. Любоў вылучалася на першае месца, і яна выражала адносіны да Бога і адносіны да ўсяго іншага. На падмурку гэтых галоўных дабрачыннасцей у этыка-педагагічнай думцы Беларусі распрацоўваліся многія аспекты мэтавызначэння ў маральным выхаванні.

Такім чынам, згодна з вызначанай перыядызацыяй на першым этапе, што характарызуецца цэласнасцю светаўспрымання і хрысціянска-арыентаваным бачаннем сэнсу быцця, распрацоўваўся змест маральнага выхавання, які вызначаў адносіны да Бога і грамадства. Асновапаложнымі каштоўнасцямі з’яўляліся вера, надзея і любоў. На другім этапе з антрапалагізацыяй этыка-педагагічных ідэй, прызнаннем самакаштоўнасці

МГПУ им. И.П. Шамякина

чалавека як найвышэйшага тварэння Бога змест маральнага выхавання ўзбагачаецца самавыхаваўчай арыентацыяй, фарміраваннем адносін да сябе. На трэцім этапе мараль усведамляецца ў якасці найважнейшага арганізатара грамадскага і грамадзянскага ўладкавання людской супольнасці і выхаваўчы змест дапаўняецца аспектам грамадзянскай скіраванасці. Грамадзянская справядлівасць дапаўняе пералік асноўных каштоўнасцей грамадства. Развіццё мэтавызначэння ў маральным выхаванні, абапіраючыся на шматлікія крыніцы, пад уплывам мноства ўмоў і фактараў выкрышталізавала яго ў адладжаную сістэму. Аснову яе ўтваралі сукупнасць рыс і якасцей, уласцівых маральна дасканаламу чалавеку. Узровень маральнасці на першым этапе вобразна выражаўся сумленнем перад Богам і грамадствам, на другім этапе паказчык маральнасці дапаўняецца сумленнем перад сабой, на трэцім – перад дзяржавай. Эвалюцыя маралеўтваральных каштоўнасцей і паказчыкаў маральнага развіцця асобы схематычна выглядае наступным чынам:

| Этап | Каштоўнасці | Паказчык маральнасці |
|---|---|---|
| I этап | вера, надзея, любоў | сумленне перад Богам і грамадствам |
| II этап | вера, надзея, любоў, самакаштоўнасць асобы | сумленне перад Богам, грамадствам і сабой |
| III этап | вера, надзея, любоў, самакаштоўнасць асобы, грамадская справядлівасць | сумленне перад Богам, грамадствам, сабой і дзяржавай |

Як бачна з табліцы, на працягу разглядаемага перыяду развіццё фундаментальных каштоўнасцей і вытворных ад іх паказчыкаў маральнасці асобы адбываліся ў накірунку секулярызацыі і дэмакратызацыі з прызнаннем самазначнасці і самакаштоўнасці кожнага чалавека. Такім чынам, у Беларусі X–XVIII стст фарміруецца даволі ўстойлівая сістэма поглядаў аб тэалагічных асновах маральна-выхаваўчага працэсу. Наяўнасць у іх агульначалавечых маральных каштоўнасцей забяспечвала пераемнасць у выхаванні і адаптацыю да адпаведных умоў быцця, якія ў сваю чаргу надавалі этыка-педагагічнай думцы Беларусі адзначаныя вышэй адметнасці.

Маральна-выхаваўчыя арыентацыі, што грунтаваліся на духоўных каштоўнасцях грамадства, пры ўсім іх эвалюцыянаванні на працягу разглядаемага перыяду інтэграваліся ў перспектыўную мэту маральнага выхавання.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна сцвярджаць, што ў якасці арыенціра маральна-духоўнага ўдасканалення вылучаўся маральны ідэал, змястоўна-сутнаснае напаўненне якога мянялася на працягу гісторыі развіцця грамадства. Але абагульненым ён уяўляў цэласную, цнатлівую,

МГПУ им. И.П. Шамякина

дабрачынна-арыентаваную асобу з актыўнай жыццёвай пазіцыяй і высокім узроўнем маральнай свядомасці і волі, якія прадвызначалі станоўчыя адносіны да маральных каштоўнасцей і ўзорныя паводзіны заўсёды і ва ўсім. Увогуле, сукупнасць сацыяльна-духоўных каштоўнасцей тагачаснага грамадства даволі выразна адлюстроўвалася ў мэтах маральнага выхавання.

Літаратура

1. Селиванов, В. С. Основы общей педагогики: теория и методика воспитания: учебн. пособие для студентов высш. пед. учеб. заведений / В.С. Селиванов; под ред. В.А. Сластенина. – М.: Издательский центр «Академия», 2002. – 336 с.

2. Марьенко, И. С. Нравственное становление личности школьника / И.С. Марьенко. – М.: Педагогика, 1985. – 104 с.

3. Катович, Н. К. Личностно-ориентированный подход к деятельности педагога как условие гуманизации учебно-воспитательного процесса / Н.К. Катович// Гуманистическое формирование личности в современных условиях: сб. науч. статей / Нац. институт образования / Науч. ред. О.П. Котикова. – Минск: НИО, 1998. – С. 98–107.

4. Никандров, В. Д. Нравственные уроки православия / В.Д. Никандров // Педагогика. – 1997. – № 3. – С.17–24.

5. Никандров, Н. Д. Ценности как основа целей воспитания / В.Д. Никандров // Педагогика. – 1998. – № 3. С. 3–10.

6. Туровский Кирил. Повесть о белоризце-человеке и монашестве / Кирилл Туровский // Златоструй. Древняя Русь X–XIII веков. – М.: Молодая гвардия. – 1990. – С. 208.

МГПУ им. И.П.Шамякина